**С.В.Пуш**, *выкладчык*

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ І АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ КАФЕДРЫ МАСТАЦТВА ЭСТРАДЫ

Спецыфіка і роля эстраднага мастацтва ў працэсе эстэтычнага выхавання, павышэння значнасці ўсіх бакоў духоўнага жыцця чалавека патрабуюць удасканалення сістэмы вышэйшай музычнай адукацыі. Структура навучальна-выхаваўчага працэсу на кафедры мастацтва эстрады, яе вучэбна-метадычная дзейнасць накіраваны на падрыхтоўку высокакваліфікаваных эстрадных выканаўцаў – спецыялістаў, здольных на сучасным прафесійным узроўні ажыццяўляць выканальніцкую, педагагічную, арганізацыйную, мастацка-творчую дзейнасць.

Выпускнік, які атрымлівае спецыяльнасць "кіраўнік эстраднага калектыву, выкладчык, артыст эстраднага аркестра (ансамбля)" павінен быць прафесіянальна творчай асобай, дастаткова падрыхтаванай да нестандартнага вырашэння шматлікіх выхаваўчых, інструментальна-выканальніцкіх і педагагічных задач у сучасных умовах.

Эстраднае мастацтва ў адрозненне ад іншых відаў мастацтва – даволі малады жанр. Калі іншыя віды мастацтва, сфарміраваныя на працягу стагодддзяў, маюць вялікі айчынны і замежны рэпертуар, забяспечаны навуковымі працамі, падручнікамі, маюць шматлікі арсенал фонадакументаў з запісамі твораў знакамітых кампазітараў, то ў эстрадным мастацтве пакуль што існуюць праблемы стварэння спецыяльнай навукова-метадычнай літаратуры па падрыхтоўцы прафесійных эстрадных выканаўцаў на адпаведным узроўні, тэарэтычнага асэнсавання агульных прынцыпаў прафесійнага станаўлення эстраднага музыканта-выканаўцы.

Улічваючы такое становішча, на кафедры ствараюцца вучэбныя дапаможнікі, праграмы па розных дысцыплінах, каляндарныя графікі самастойнай работы студэнтаў, удасканаль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваюцца вучэбныя планы спецыялізацый, тэхналогія навучання (распрацоўваюцца асобныя тэмы).

Асаблівая ўвага ўдзяляецца выканальніцкай практыцы студэнтаў; яна павінна ажыццяўляцца пастаянна, уключаць ігру ў ансамблях, эстрадным аркестры. Але часта студэнты сустракаюцца з цяжкасцямі аркестравага выканаўства, не маюць дастатковых навыкаў чытання з ліста, што неабходна для хуткай і правільнай арыентацыі ў нотным тэксце з выкананнем вызначаных кампазітарам тэмпу, штрыхавых і дынамічных абазначэнняў. Праблему можна вырашыць шляхам увядзення адпаведных дысцыплін, якія накіраваны на падрыхтоўку студэнта да самастойнай дзейнасці і павышэнне яго інструментальна-выканальніцкага ўзроўню. Мэтазгодным было б выкладанне прадметаў "Гісторыя выканаўства" (для студэнтаў па спецінструменце – скрыпка, віяланчэль, фартэпіяна, гітара і інш.) і "Дырыжыраванне" (асабліва для выканаўцаў на струнных інструментах).

План вывучэння асобных дысцыплін на кафедры прадугледжвае выкарыстанне разнастайных формаў заняткаў: індывідуальных, групавых, лекцыйных.

Існуючыя на кафедры прадметна-метадычныя камісіі ажыццяўляюць розныя формы кантролю за ўзроўнем падрыхтоўкі студэнтаў, правядзеннем залікаў і іспытаў, разглядаюць вучэбныя планы, праграмы, метадычныя рэкамендацыі. Пастаянна арганізуюцца ўзаеманаведванні заняткаў выкладчыкамі розных дысцыплін.

Асаблівая ўвага накіравана на самастойную работу студэнтаў – фарміраванне навыкаў самаадукацыі і самавыхавання, рацыянальнае размеркаванне часу, самастойнае вывучэнне музычнага твора, што прадугледжвае пэўны тэмп працы, сістэматычнасць і рэгулярнасць заняткаў, наяўнасць адпаведных валявых якасцей у навучэнцаў.

Умовамі для ажыццяўлення якаснай падрыхтоўкі прафесійных эстрадных выканаўцаў з'яўляюцца перадача ўласнага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вопыту высокакваліфікаваных выкладчыкаў студэнтам, сумесныя са студэнтамі выступленні на прафесійнай сцэне, а таксама адпаведнае навукова-метадычнае забеспячэнне (вучэбныя планы, вучэбныя праграмы, рэпертуарныя зборнікі), развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы, сучаснай тэхналогіі апрацоўкі і запісу гуку.

Вучэбныя праграмы як галоўныя кампаненты вучэбна-метадычнага комплексу з шэрагам дыдактычных сродкаў вызначаюць мэты навучання і выхавання студэнтаў, змест прадмета, мадэліруюць сам працэс навучання. Стварэнне праграм на кафедры мастацтва эстрады адбываецца з улікам зместу кваліфікацыйных характарыстык, прафесійных задач спецыяліста, адпаведнага аб'ёму ведаў і адведзенай для іх засваення пэўнай колькасці гадзін.

Важнае значэнне для падрыхтоўкі кваліфікаванага спецыяліста мае педагагічная практыка. У якасці базавых устаноў практыкі могуць быць музычныя студыі, дзіцячыя музычныя школы, каледжы, ліцэі, сярэднія агульнаадукацыйныя школы з музычным ухілам, музычныя вучылішчы, а таксама падрыхтоўчыя курсы ва універсітэце.

На працягу педагагічнай практыкі студэнты знаёмяцца з дзейнасцю навучальнай установы, яе матэрыяльна-тэхнічнай базай, арганізацыяй уступных экзаменаў і іншым, назіраюць і ўдзельнічаюць у працэсе навучання і выхавання вучняў, вывучаюць педагагічны вопыт асобных выкладчыкаў.

Пры падрыхтоўцы прафесійных эстрадных выканаўцаў выкладчыкі прадугледжваюць міжпрадметную сувязь такіх дысцыплін, як імправізацыя, інструментальны ансамбль, эстрадны аркестр, эстрадная аранжыроўка, джазавая гармонія і інш. Гэта павышае эфектыўнасць вучэбнага працэсу па падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ